ТЫ НЕ ЗНІКАЙ, МАЁ СЯЛО,-
ШУКАЛІ БЕРАГ ТВОЙ ЖА ЛЮДЗІ,
І ТЫ ДАЎНО Ў ЯГО ЎРАСЛО
СВАІХ КАРЭННЯЎ МАЗАЛЯМІ.
ЖЫВІ І ВОКНАМІ СВЯЦІ
І Ў СВЕТЛЫМ МАРЫВЕ БЫЛІННЫМ
ЗА ЖУРАЎЛЯМІ НЕ ЛЯЦІ
ТРЫВОЖНЫМ І ПРАЦЯЖНЫМ КЛІНАМ.
НЕ, НЕ ПРАЙШЛА ТВАЯ ПАРА,
НЕ АДЦВІЛІ ТВАЕ РАМОНКІ.
І ВОЧЫ Ў СЫНОЎ ГАРАЦЬ
РАМОНКАЎ КОЛЕРАМ ЗДАВЁНКУ.
ПАЧУЙЦЕ ЗВОНКІ ГОЛАС ІХ
І БУДЗЬ ДУШОЙ І ДУМКАЙ ЧЫСТАЙ.
І ДЛЯ ПРАПРАЎНУКАЎ СВАІХ
ПАМАЛАДЗЕЙ ГАДОЎ НА ТРЫСТА.



# ВІЗІТКА ВЁСКІ

БАБРАЎНІКІ – вёска ў Варнянскім сельскім Савеце. Знаходзіцца на адлегласці 20 км ад Астраўца на паўночным усходзе Астравецкага раёна, у 270 км ад абласнога цэнтра, г.Гродна, у 24 км ад бліжэйшай чыгуначнай станцыі Гудагай.

Былы цэнтр сельсавета і калгаса “Звязда”. Працавала бібліятэка, магазін. Ёсць помнік воінам – аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Планіроўка, аблічча вёскі часта вызначаецца характарам мясцовасці,дзе яна размешчана. Бабраўнікі мала нагадваюць традыцыйную беларускую вёску, звычайна збудаваную абапал больш-менш прамой дарогі – вуліцы.

# АДКУЛЬ У ВЁСКІ ІМЯ

По легендзе назва ўзнікнення вёскі такая: даўным-даўно ў гэтых мясцінах было шмат балот і сажалак, у якіх вадзілася мноства баброў. Адсюль і назва — Баброўнікі. Доўга яшчэ мясцовасць знаходзілася паміж непралазных балот, дзе тапілася не толькі жывёла, але і людзі.

# Комары
# Петрыкі
# Мураўскія
# Радзевічы

тыповыя
для вёскі
прозвішчы.

# ЧАС УТВАРЭННЯ ВЁСКІ.

Дакладны час утварэння вёскі Бабраўнікі невядомы і пакуль што застаецца недаследаваным. З архіўных крыніц (Г.Брэгер. Старажытая Астраеччына //Астравецкая праўда.1994.-15 студзеня.-с.3) вядома, што ў канцы 17 ст., паводле інвентара 1692 г. існавала Бабраўніцкае войтаўства, куды ўваходзілі Вялікія і Малыя Бабраўнікі, Гіры, Рымдзюны, Бадзівалы, Шатэрнікі і новая на той час вёска Савічуны, якая не ідэнтыфікавана. Яшчэ раней, у 15 – 16 ст.ст. Бабраўнікі ўваходзілі ў склад Высакадворскай воласці Віленскага ваяводства. Воласць знаходзілася на поўдні ракі Віліі, там жа знаходзілася і гаспадарская сядзіба Вялікі Двор. Побач з ёю раскінулася вёска Бабраўнікі. Разам з Бадзівaламі і Лавейкунамі (цяпер Валэйкуны Міхалішскага с/С) Бабраўнікі ўпершыню згадваюцца ў 1557 годзе. Вёска Шатэрнікі згадваецца яшчэ раней – у 1550 г. У 16 ст. высакадворская воласць разам з Немажанскай, Завілейскай, Медніцкай, Рудамінскай і інш. уваходзіла ў Вілейскую эканомію з цэнтрам у Віленскім замку. Віленская эканомія падзялялася на некалькі валасцяў ці маёнткаў, якія пазней, у 18 ст., атрымалі найменне “ключоў”. У другой палове 17 ст. Высакадворскі ключ быў падзелены на два войтаўствы – вёскі ў Віленскім павеце ўвайшлі ў Бабраўніцкае войтаўства, а вёскі Ашмяскага павета – у Завілейскае, якое ў 18 ст. часам называлася Свіранскім- ад вёскі Свіраны (б.Ёдупе). У 1763 г. у Бабраўніцкім войтаўстве ўзнікла яшчэ адна вёска – Кністушкі.

Высакадворскі ключ, як і іншыя каралеўскія маёнткі ВКЛ, здаваўся ў заставу ці ў арэнду розным дваранам і дзяржаўным дзеячам за службу, прычым яны плацілі пэўны працэнт з даходаў маёнтка - скарб. Пры гэтым абавязкова складваўся інвентар, у якім пералічаны прыбыткі маёнтка. Так, у 1692г. Высокі Двор быў застаўлены Ломжынскаму лоўчаму Фартунату Замойскаму, а ў 1763 г. аддадзены ў арэнду быстрыцкаму старасце Станіславу Бжастоўскаму.

# ГАСПАДАРЧАЕ І САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА НАСЕЛЬНІЦТВА ВЫСАКАДВОРСКАГА КЛЮЧА ў 1692 і 1763 гг.

Паводле івентароў валокі засяваліся толькі на 60% зямель. Да прыкладу, у 1692 г. зямля апрацоўвалася поўнасцю. Прычынай таму быў магутны дэмаграфічны крызіс, выкліканы разбуральнай руска-польскай вайной, у час якой насельніцтва ВКЛ скарацілася амаль напалову, а эканамічны ўздым праходзіў вельмі марудна. Другі інвентар складзены пасля эканамічнага крызісу выклiканага Паўночнай вайной, калі ў сельскай гаспадарцы адбываўся прыкметны рост.

У 1692 г. у Бaброўніцкім войтаўстве было пяць вёсак, заселеных цяглымі сялянамі і дзве (Бадзівалы, Шатэрнікі) – зямянамі. Усяго ў вёсках было дымоў (падвор’еў)- 86 (74 цяглых і 12 зямянскіх), частка з іх вызвалялася на некалькі год ад падаткаў (так званыя “на слабадзе”).Зямлі ўсяго ў войтаўстве было 144,5 валокі, з якіх 62,5 валокі (ці 43%), не апрацоўваліся (“пустыя”). Невялікая колькасць валок была вызвалена ад падаткаў на некалькі год, а некаторыя сяляне, акрамя цяглай, карысталіся і вольнай зямлёй, не абкладзенай падаткамі, за што выконвалі абавязкі на адміністрацыйных пасадах – гэта цівун Бартламей Рудзіс з Гір, лаўнікі Адам Лапінскі (адтуль жа), Якуб Шэпесэль з Вялікіх Баброўнікаў, Сымон Алёхна з Рымдзюн.

Сяляне мелі ў сваім карыстанні ад 1/6 да 1 валокі цяглай зямлі кожны, а ў большай часткі сялян –1/4 ці ½ валокі і столькі ж прыёмнай зямлі. З адной цяглай валокі быў устаноўлены гадавы падатак: чыншу – 4 зл. 15 гр., дзякла – па адной бочцы жыта і аўса, дзве курыцы, адна гуся, 20 яек, адзін звязак (дзесятак) ільну і адзін воз сена, а таксама адпрацовачная павіннасць (паншчына).

З прыемнай валокі сяляне плацілі толькі чынш – 10 зл.,(у Рымдзюнах і Савічунах – 6 зл.). У зямян падаткі і абавязкі з валокі былі іншымі. Па-першае (тут яны карэнным чынам адрозніваліся ад сялян), зямяне не хадзілі на паншчыну, з валокі штогадова давалі двару: чыншу – 25 зл., у Бадзівалах – 22 зл., у Шатэрніках, дзякла – адна курыца, адна гуся, 20 яек, адзін воз сена ці дзесятак звязкаў ільну. У 1692 г. у войтаўстве меркавалася сабраць 704 зл. 7 гр. чыншу, не лічачы дзякла. У 1696 г., калі павінен быў закончыцца тэрмін "свабоднасці" некаторых валок, якія пераходзілі ў разрад цяглых, чынш узрастаў да 76 зл. 23 гр.

Паншчына складала для сялян з цяглай валокі чатыры дні ў тыдзень, але паколькі сяляне валодалі ў сярэднім ¼ - ½ валокі, дык з дыма адпрацоўвалі звычайна адзін – два дні ў тыдзень. Работа на дворным полі (паншчына) працягвалася з шасці гадзін раніцы да захаду сонца. Акрамя таго, сяляне абавязаны былі хадзіць на талокі: у год з валокі -–пяць талок на прадзенне ільну і шэсць талок на збор скошанага сена і малацьбу збожжа, а таксама даваць чатыры падводы для адвозкі тавараў у Вільню, адпрацоўваць 12 гвалтаў па рамонту дворных пабудоў і выканання іншых работ, таксама па чарзе павінны былі вартаваць гаспадарскі двор. Абавязкі ж зямян, акрамя чыншу і дзякла, былі наступныя: для вескі Шатэрнікі - чатыры паездкі ў год у Вільню з рознымі даручэннямі, а таксама дзве паездкі на адлегласць да 50 міль (каля 400 км), а для Бадзівалаў – тое ж самае адпаведна ў колькасці шэсць і адна.

Акрамя таго ў Генеральнай уставе ўсяго Высакадворскага ключа апісаны агульныя абавязкі для ўсіх падданых маёнтка, рэгламантаваны ўсе выплаты па судоваму справаводству за прычыненне шкод, адбыванне пакарання злачынцамі. Без спецыяльнага дазволу кіраўніка маёнтка забаранялася апрацоўваць пустыя землі, звозіць і прадаваць пустыя дамы, засяваць чужыя землі (пад пагрозай страты ўсяго збожжа). Забаранялася без дазволу пераходзіць з месца на месца, з вёскі ў вёску. Калі б хто-небудзь збег з вёскі, а аднавяскоўцы яго не затрымалі, тады яны павінны былі б заплаціць віны 10 копаў грошай, а таксама трохгадовы чынш за ўцекача.

За ўсім, што рабілася ў вёсках, сачыла, дакладваючы кіраўніку двара, сельская адміністрацыя – войты і лаўнікі. Пушчу пільнавалі, каб ніхто ў ёй без дазволу не сек дрэў, прызначаныя дваром ляснічыя. Звяроў, здабытых у лесе паляўнічымі, трэба было аддаваць у двор – за іх была ўстаноўлена ўзнагарода: за лася, напрыклад. – 5 зл., за мядзведзя – 3 зл., за рыся –4 зл., за ваўка – 2 зл. Калі ж хто з сялян меў у пушчы бортных пчолаў, то аддаваў двару палову мёду. А з вулляў – трэцюю частку. Як відаць з інвентара, раней многія сяляне трымалі ў сваіх дамах шынкі і выраблялі гарэлку і піва, але нават уставай забаранялася ім гэтым займацца без дазволу, а хто меў такі дазвол, павінен быў уплочваць капшчыну. З дыма кіраўнік здымаў таксама па паўзлотаму кварты ў скарб Рэчы Паспалітай на ўтрыманне войска.

Паводле новага інвентара (1763г.) можна ўявіць архітэктурнае апісанне сядзібы Высокі Двор. Яна (сядзіба) разам з дворнай зямлёй размяшчалася паміж вёскамі Вялікія Баброўнікі і Гродзі. Стары сядзібны дом (“рум”) знаходзіўся справа ад уязной брамы.

На дворным дзядзінцы знаходзіліся вялікі спіхлер (амбар), стайня з жыллём конюха, свіран, абора і інш. гаспадарчыя пабудовы. У баку ад сядзібы размяшчалася гумнішча, на якое вялі асобныя вароты. Гумнішча складалася з двух гумнаў – вялікага і малога, а побач былі адрына, сырнік, у цэнтры – стары запушчаны дом урадніка, а за ім – стары бровар з лазняй і аўчарня. Усе пабудовы, як двара, так і гумнішча былі драўляныя, агароджваліся парканам.

Дворныя землі дзяліліся на тры полі. Засеў жыта на 1763 г. склаў 17.25 бочак віленскай меры. На дворных сенажацях як у Баброўніцкім, так і ў Завілейскім войтаўствах, укос складаў па 100 вазоў сена.

У Бабраўніцкім войтаўстве ў 1763 г. лічылася ўжо восем вёсак, а пры іх – сем заселеных засценкаў. У вёсцы Бадзівалы пражывалі зямяне, а ў Шатэрніках і Кністушках – баяры, у астатніх –і сяляне, і баяры разам.Дымоў усяго было 150, што на 64 дымы больш, чым у 1692 г. Агульная зямельная плошча, аднак скарацілася і склала 120,5 валокі пры той жа колькасці пустой зямлі – 63 валокі ці 52%. Такім чынам, на адну гаспадарку у 1763 г. прыходзілася значна менш зямлі, якая апрацоўвалася, чым у 1692 г., бо дадатковая (прыёмная) зямля была толькі ў невялікай частцы сялян.

Чынш з цяглай валокі складаў 16 зл., а з прыёмнай – 40 зл., баяры і зямяне, якія жылі асобнымі вёскамі, плацілі па 30 зл. з валокі, а баяры, што жылі разам з сялянамі – па 50 зл.Такі рэзкі рост падаткаў тлумачыцца дэвальвацыяй злотага за 70 год болей, чым у два разы аднак чынш для сялян усё роўна некалькі павялічыўся. Дзякла жытам і аўсом засталося ранейшым – па адной бочцы, а астатняе заменена грашыма ў колькасці 9 зл. 20 гр.Баяры і зямяне, у адрозненне ад інвентара 1692 г., ні дзякла, ні дзякельных грошай не давалі. Усяго з войтаўства ў 1763 г. меркавалася сабраць чыншу 2157 зл. што, з улікам дэвальвацыі злотага, некалькі больш, чым у 1692 г. і 1696гг., але з дыма ў сярэднім прыходзілася меншая сума з-за рэзкага павелічэння колькасці дымоў.

Усяго даходы з войтаўства павінны былі скласці, улічваючы дзякельнае і кошт жыта і аўса, 3118 зл. Паншчына для сялян павялічылася ўдвая – чатыры дні ў тыдзень з паўвалокі, але паколькі ў большасці гаспадарак было па чвэрці валокі, то з дыму звычайна адпрацоўвалі на дворным полі па два дні ў тыдзень. На варту двара даводзілася хадзіць па тыдню з паўвалокі 12 гвалтаў і 4 падводы ў год засталіся тыя ж.

Баяры на паншчыну не хадзілі і дзякла не давалі. Іх гадавая павіннасць складала з валокі:12 гвалтаў на ўборку сена і збожжа, суправаджэнне падвод з таварам у Вільню ці 20 міляў (160 км) чатыры разы ў год. Зямяне, якія жылі толькі ў в.Бадзівалы, - тры сям'і Бублевічаў, Тамаша Скуркі, Мацея Петрыка і Яна Сыманойця – акрамя чыншу абавязаны былі толькі ездзіць з лістамі ў Вільню (ці да 20 міляў) чатыры разы на год

Як відаць з інвентароў 1692 і 1763 гг., становішча цяглых сялян за 70 год значна пагоршылася. Хоць чыншу сяляне ў 18 ст. выплачвалі менш, але зямлі, якая апрацоўвалася, на гаспадарку прыходзілася ўдвая менш, чым у 17 ст. Колькасць дзён паншчыны таксама павялічылася ўдвая. Узмацненне прыгону прасочвалася на працягу ўсяго перыяду з другой паловы 16 ст. да 18 ст. Маёмаснае і сацыяльнае становішча прывілеяванай часткі сельскага насельніцтва, баяраў і зямянаў, наадварот, некалькі палепшылася. Яны дамагліся адмены некаторых павіннасцяў. Баяры і зямяне з'яўляліся нашчадкамі служылага саслоўя, якое валодала зямлёй за ваенную службу каралю але, не дамогшыся прывілеяў павятовай шляхты, засталося васаламі каралеўскіх маёнткаў.

Каралеўскія кіраўнікі гаспадарскіх двароў спрабавалі іх абкласці дадатковымі падаткамі, але баяры, якія захавалі старыя прывілеі і дакументы, аспрэчвалі гэтыя імкненні ў караля і дамагаліся свайго. Аднак, па ўкладу жыцця яны мала чым адрозніваліся ад прыгонных сялян.

Агульны даход з сялянскіх, баярскіх і зямянскіх гаспадарак Высакадворскага ключа ў 1763 г. склаў 4331 зл. Акрамя таго ў скарб ішлі грошы за арэнду корчмаў суседнімі памешчыкамі ці васакадворскімі сялянамі. Напрыклад, арэнда Рымдзюнскай карчмы складала 650 зл. у год, Жукойненскай – 60 зл. З жыхароў вёсак збіралі таксама гіберну - падатак на ўтрыманне войска ВКЛ, якая ў 1763 г. склала 1789 зл. прызначаліся коннаму палку, а 465 зл. – харугве пагранічнай варты, рэшта (229 зл.) ішла ў скарб ВКЛ

Калі падсумаваць усе падаткі і даходы, Высакадворскі ключ даваў агулам 7485 зл. у год.

Усяго ў сялян Высакадворскага ключа было 30 коней, 286 валоў, 168 пней (вулляў) пчол. Насельніцтва ключа складала 477 чалавек мужчынскага полу, у тым ліку 207 гаспадароў (дымоў). Агульная колькасць зямлі – 74 валокі, у т.л. 35 валок пустых (47%). Як бачна, колькасць зямлі, якая апрацоўвалася рэзка зменшылася, бо зменшылася колькасць дымоў (у вёсках Свіраны, Палхуны, Свідруны), а гаспадар таксама трымаў некалькі менш зямлі, чым ў 1692 г.

# ГІСТОРЫЯ КАЛГАСНАГА ЖЫЦЦЯ

У першыя гады калгаснага жыцця, сяляне працавалі раздзельна адзін ад аднаго. Гаралі плугам, жалі сярпом, малацілі цэпам. У многіх сялян не было нават і плуга. Ураджай быў вельмі малы. Каб жыццё стала лепшым, усім трэба аб’ядноўвацца і працаваць разам, а не паасобку. У 1949г. было аб’яднаны тры першыя калгасы: імя Дзяржынскага (старшыня Свіла Антон Андрэеевіч), “Звязда” (Петрык Станіслаў Ігнатавіч), ”Знамя” (Боўша Іван Андрэееіч). У цяперашні час в. Бабраўнікі ўваходзіць у калгас імя Чапаева(старшыня Рук Уладзіслаў Эдуардавіч, Вярбовіч Аляксандр Часлававіч).

# АДУКАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

У вёсцы Бабраўнікі доўгі час не было школы – да 1937 года. Хто меў магчымасць і жаданне вучыцца хадзілі ў Варнянскую сямігодку. Толькі у 1937 годзе ў Бабраўніках быў пабудаваны будынак для пачатковай школы. Першым настаўнікам пачатковай школы быў Арлоўскі (імя і імя па бацьку невядома). Пасля вайны Бабраўніцкая пачатковая школа была ператворана ў сямігодку. Першы выпуск навучэнцаў быў у 1949 г. У 1960 г. вучэбная пляцоўка школы была пашырана: пабудаваны дадаткова два класныя пакоі, майстэрня, буфет.Навучанне ішло ў адну змену. За час існавання школы было выпушчана 250 вучняў. Восем з іх атрымалі ў далейшым вышэйшую адукацыю. У мясцовым калгасе зараз працуе 30 былых вучняў школы. Першым камсамольцам Бабраўніцкай школы быў Свіла Іван. З 1977 г. школа зноў стала пачатковай.

# ПОМНІКІ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У цэнтры вёскі ў 1968г. ўстаноўлены помнік загінуўшым землякам. Ім ушанаваны 14 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На гранітным камні выбіта 14 прозвішчаў землякоў:

- Вака Станіслаў Уладзіслававіч
- Лукша Станіслаў Імпалітавіч
- Петрык Іван Міхайлавіч
- Русенчык Іосіф Казіміравіч
- Свіла Юльян Антонавіч
- Шкіруць Іван Іванавіч
- Петрык Мечыслаў Тамашавіч
- Мажэйка Антон Браніслававіч
- Мажэйка Сільвестар Браніслававіч
- Мажэйка Баляслаў Антонавіч.

# УЛАДАЛЬНІК БАБРАЎНІК

На хутары Бабраўнікі быў пабудаваны маёнтак пана Заянчкоўскага. Працавалі на яго парабкі і служанкі. Маёнтак быў на два паверхі. На першым жылі парабкі. Пан меў 70 гектараў зямлі. Разам з ім пражывалі чатыры яго родныя сёстры (паненкі). Паненкі мелі землі (Шульнікі, Плянтоўка). Сям'я Заянчкоўскіх была адукаванай і свабодна валодала французкай мовай. Адна з іх, якую называлі Эвалінай працавала гувернанткай у Вільні. Яна вучыла французскай мове дзяцей аднаго знатнага пана. Другая – Антаніна – палюбіла фурмана, які працаваў на пана Заянчкоўскага. За гэта бацька Заянчкоўскі выгнаў яе з маёнтка і ўся радня яе выраклася. Антаніна са сваім конюхам выехала ў Свір, дзе яны набылі невялікую хатку. Антаніна вельмі сумавала па сваіх родных і аднойчы вырашыла наведаць іх. Але яна падыйшла толькі да маёнтка, дамоў жа яе пан Заянчкоўскі не пусціў, а спусціў на яе сабак.Так яна ні з чым вярнулася назад у Свір. Болей да радні не наведвалася.

Трэцяя паненка (імя яе людзі не памятаюць) выйшла замуж на Літву за знатнага графа. Пан Заянчкоўскі памёр у сваім маёнтку. Быў пахаваны на могілках у в. Міхалішкі. Адну з яго дачок, калі прыйшла Савецкая ўлада, вывезлі прымусова ў Казахстан.

Маёнтак пана Заянчкоўскага быў забраны пад сельсавет. З часам, калі жыць было вельмі цяжка, не хапала дроў, сталі разбіраць дах маёнтка.Таксама быў знішчаны і вялікі сад, які знаходзіўся вакол маёнтка.З часам абвалілася і сталяванне, сталі разбіраць будынак. Хто цягаў цэглу, хто дошкі, хто бярвенні. Вось так сумна закончыў маёнтак Заянчкоўскіх. У наш час на яго месцы можна знайсці толькі груду камення, парослы травой, ды калодзеж, які захаваўся да нашага часу. Жыхарка з Бабраўнік Тумінская Ф.І. доўгі час працавала са сваім мужам парабкамі ў гэтым маёнтку.З яе слоў і запісана гэта гісторыя.

# ГІСТОРЫЯ КАЛГАСНАГА ЖЫЦЦЯ

Ідэю стварэння сумеснага жыцця ў Бабраўніках, як і ў астатніх рэгіёнах Заходняй Беларусі падтрымлівалі далёка не ўсе. Аднак у першыя пасляваенныя гады калектывізацыя дакацілася і да гэтых мясцін. У 1949 г. тут былі сфарміраваны тры каласы – імя Дзяржынскага, старшынёй якога быў Антон Андрэевіч Свіла, “Звязда” (Станіслаў Ігнатавіч Петрык), “Знамя” (Іван Андрэевіч Боўша).

Працаваць адразу даводзілася таксама ўручную: аралі, жалі, малацілі. Пакрысе пачалі набываць тэхніку: трактары, жаткі, сеялкі, пазней камбайны і інш. З гадамі расла прадуктыўнасць працы – падымаліся надоі, прывагі, большай стала ўраджайнасць збожжавых культур.

З цягам часу дробныя калгасы сталі аб’ядноўвацца.

# УСТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Першым падпольшчыкам у гэтых мясцінах яшчэ пры польскай уладзе быў Лукша Іван Адамавіч, 1895 года нараджэння, ураджэнец в. Бабраўнікі. Па яго ініцыятыве ў 1926 г. у Варнянах была арганізавана падпольная група, у склад каторай уваходзілі І.Лукша, К.Узарэвіч, К.Сячынскі, А.Мажэйка. У тым жа годзе была арганізавана камуністычная група, у склад якой уваходзілі Гражуль І., Масіеўскі Рамуальд, Бяляўскі Ізыдор, Бублевіч Франц. Гэтыя маленькія групы вялі барацьбу супраць польскай буржуазіі, размнажалі лістоўкі і газеты. У такіх акцыях актыўны ўдзел прынялі Рацкевіч Юстын,які раней жыў у вёсцы Бабраўнікі, Лукша Іван, які за восем месяцаў 1929 года быў восем раз арыштаваны і пасаджаны ў турму. Пазней ён уцёк адтуль. У 1929 г. пры дапамозе КПЗБ ён выехаў за граніцу, у Францыю, дзе і пражыў 17 гадоў. Працуючы на розных пасадах вёў барацьбу з фашызмам. У 1939 г. быў асуджаны гестапам на смерць, але з дапамогай таварышаў здолеў уцячы. Быў знаёмы з Торезом, з'яўляўся членам камуністычнай партыі Францыі. Пражываў у Нямеччыне, Літоўскай ССР.

# У ПОЛЫМІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На тэрыторыі Бабраўнік і тутэйшых мясцін значных ваенных дзеянняў не было. Не быў развіты тут і партызанскі рух. Толькі асобныя жыхары ваявалі на франтах Чырвонай Арміі супраць нямецкіх захопнікаў. У няроўных змаганнях загінулі за Радзіму мясцовыя жыхары: Вако Станіслаў Уладзіслававіч, Лукша Станіслаў Імпалітавіч, Петрык Іван Міхайлавіч, Русенчык Іосіф Казімір, Свіла Юльян Антонавіч, Шкіруць Іосіф Іванавіч, Петрык Мячэслаў, Тамашавіч, Мажэйка Антон Браніслававіч, Мажэйка Сільвестр Браніслававіч, Мажэйка Баляслаў Антонавіч. Ардэнамі і медалямі былі ўзнагароджаны 34 чалавекі.

# ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

У 1955 годзе на тэрыторыі Бабраўнік была пабудавана бібліятэка, якой загадвала Астроўская Марыя Антонаўна. Пасля яе доўгі час у Бабраўніцкай сельскай бібліятэцы працавала Багачова Антаніна Фамінічна.

Кніжны фонд у 1966 г. складаў 6 628 экзэмпляраў, чытачоў – 428. Для лепшага абслугоўвання чытачоў былі арганізаваны 3 перасоўкі ў вёсках Рудзішкі, Валэйкуны, Шульнікі. У той час пры бібліятэцы працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, у якіх было 22 чалавекі.

У 1971 г. бібліятэка размяшчалася ў клубным будынку, якое пазней было знесена. Пад бібліятэкай тады было 36 квадратных метраў, фонд складаў 7866 экзэмпляраў дакументаў. У тым годзе ў бібліятэку паступіла 766 экзэмпляраў кніг, газет, часопісаў. Выбыла у 1970 г. – 226 асобнікаў.Амаль палова кніжнага фонду складала мастацкая літаратура. Выдадзена ў той год было 6321 дакумент, з іх 3523 – дзецям. Чыталі ў бібліятэцы ў тым годзе 541 чалавек, з іх 137 дзяцей. Наведалі Бабраўніцкую бібліятэку 3985 разоў. Усяго было праведзена 29 масавых мерапрыемстваў, з якіх толькі 19 для дзяцей.

Працавала на той час у Бабраўніцкай бібліятэцы бібліятэкар з сярэдне-спецыяльнай адукацыяй Багачова Антаніна Фамінічна.

У 1981 годзе Бабраўніцкай сельскай бібліятэкай загадвала бібліятэкар з сярэдняй адукацыяй Бурнэйка Ганна Альфонсаўна. Кніжны фонд на той год складаў 7633 асобнікі, з іх 3173 – мастацкай літаратуры. Паступіла ў той год 415 экзэмпляраў, выбыла – 2425. Праведзена 33 масавыя мерапрымствы, з іх дзецям –25. Чытачоў у зоне абслугоўвання, якія наведалі бібліятэку за той год 1038 раз, было 236 чалавек, у тым ліку 71 дзіця.

У 1991 годзе Бабраўніцкай бібліятэкай – філіялам загадвала Комар Зоя Іосіфаўна, якая працавала на гэтай пасадзе да 2016 года. Фонд дакументаў на той час складаў 4197 асобнікаў, з іх мастацкай літаратуры налічвалася 1871 экзэмпляр.Усяго выдадзена дакументаў 1286, чыталі 101 чалавек, у тым ліку 29 дзяцей.

На 2011 год кніжны фонд Бабраўніцкай бібліятэкі складае болтьш 3 тыся экзэмпляраў, у тым ліку 2370 экз. мастацкай літаратуры. Чытала 246 чытачоў, з іх 70 дзяцей, якія разам наведалі бібліятэку 3153 разы. З 1 ліпеня 2002 года бібліятэцы нададзены статус бібліятэкі-музея. 28 чэрвеня 2016 года рашэннем Астравецкага райвыканкама №378 Бабраўніцкая бібліятэка-музей была закрыта.

# АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЮЦЬ КАМЯНІ

Паміж Гервятамі і Бабраўнікамі ёсць чубок лесу, дзе адзінока і сіратліва стаіць хатка. У жніўні 2001 года археолагі з Мінска вялі раскопкі. Кіраўнік гэтай невялікай экспедыцыі - старшы навуковы супрацоўнік інстыту гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук, кандыдат гістрычных навук Эдвард Зайкоўскі, а з ім маладая мастачка Вольга Дзядовіч і Раман Ліхашапка, выпускнік гістарычнага факультэта педагагічнага ўніверсітэта імя Танка.

Увага той экспедыцыі была звернута на велізарны камень. Уяго гладкая, нібы счасаная (ўпаўне Верагодна, што апрацавана яна старажытнымі людзьмі) паверхня. На ёй яскрава відаць правільныя паўсферычныя ямкі, размешчаныя ў пэўнай паслядоўнасці - яўны след рукі чалавека. У ходзе раскопак вакол каменя і пад ім ўдалося знайсці абломкі керамікі, адзін з іх - яўна старажытнага паходжання, і на дастаткова вялікай глыбіні - вуголле. Усё гэта дае падставы меркаваць,што камень ляжыць на гэтым месцы са старажытных часоў і служыў нашым продкам — язычнікам ахвярнікам, на якім прыносіліся дары багам.

# ПОМНІК ГІСТОРЫІ

У Бабраўніках пабудавана каплічка, якая з'яўляецца гістарычным помнікам. Пабудавалі яе ў 1856г для таго, каб людзі мелі магчымасць маліцца. Перадгісторыя ўзнікнення каплічкі такая: прыйшла ў Бабраўнікі вялікая бяда — пачалі хварэць людзі халерай і ніякага спасу не было ад той бяды. Ужо загінула ад яе многа людзей. І тады мясцовы святар прапанаваў пабудаваць на скрыжаванні дарогі каплічку, каб прасіць Бога адвесці навалу. Калі каплічка была ўзведзена, святар сабраў усіх людзей з гэтай вёскі і высвенціў каплічку. З таго часу людзі ў гзтай мясцовасці пераасталі хварэць на халеру. Каплічка ж захавалася да нашага часу.

# АДУКАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

У вёсцы Бабраўнікі доўгі час не было школы — да 1937 года. Хто меў магчымасць і жаданне вучыцца хадзілі ў Варнянскую сямігодку. Толькі у 1937 годзе ў Бабраўніках быў пабудаваны будынак для пачатковай школы, які захаваўся да нашага часу. Першым настаўнікам пачатковай школы быў Арлоўскі (імя і імя па бацьку невядома). Пасля вайны Бабраўніцкая пачатковая школа была ператворана ў сямігодку. Першы выпуск навучэнцаў быў у 1949 г. У 1960 г. вучэбная пляцоўка школы была пашырана: пабудаваны дадаткова два класныя пакоі, майстэрня, буфет. Навучанне ішло ў адну змену. За час існавання школы было выпушчана 250 вучняў. Восем з іх атрымалі ў далейшым вышэйшую адукацыю. Першым камсамольцам Бабраўніцкай школы быў Свіла Іван. З 1977 г. школа зноў стала пачатковай. На сённяшні дзень Бабраўніцкая школа закрыта, з-за некамплектнасці.

# З ЛЕКСІКІ РОДНАЙ ВЁСКІ

Кожная мясцовасць мае свае, адметныя прыказкі, прымаўкі, якія захаваліся з далёкіх гадоў мінуўшчыны. Бабраўнікі таксама маюць сваю лексіку.

1. Рыхтуй летам сані, а зімой — калёсы...

Ні адзін гаспадар не абыходзіўся ўлетку без калёс, а ўзімку - без саней. Сена, салому і снапы перавозілі на вялікім возе з высокімі драбінамі, а ўзімку на развалках. Вядома, сані рамантавалі летам, загадзя. Адсюль і ўзнікла гэтая прымаўку.

2. Хто працуе - той і мае.

3.Адклад не ідзе ў лад.

4. Спех — людзям на смех.

5. Усюды добра — а дома лепей.

6. Жыві сваім розумам, а не чужым.

7 Сам харош, а розуму ні на грош.

# МЯСЦОВЫ ФАЛЬКЛОР

З маленства і назаўсёды ўваходзіць у наша жыццё мясцовы фальклор. Спачатку ў дзяцінстве нас прываблівае мілагучная калыханка, якую спявае маці або бабуля, пазней мы захапляемся песнямі, якія гучаць у кожнай хаце, на сцэнах нашых клубаў, на вячорках. Цікавасць да мясцовага фальклору не змяншаецца і ў сталым узросце. Менавіта ў песнях праследжваецца сялянскае жыццё, іх пачуцці, захапленні, каханне. Фальклорныя песні перадаюць багаты жыццёвы вопыт народа, яго мудрыя думкі. Разам з тым нельга забываць, што ў той час, калі стваралася большая частка песень, казак, легенд, прыказак, народ быў непісьменны.

Асноўнымі адметнымі рысамі фальклору з'яўляецца калектыўнасць, якая праяўляецца ў тым, што ў стварэнні, выкананні і распаўсюджанні песень удзельнічалі многія людзі. Вельмі часта, калі ў вёсцы праходзіць якое-небудзь застолле, гулянка, то ў многіх хатах нашай мясцовасці можна пачуць песні "Чырвоная каліна", Рабінушка",'Цячэ вада ў ярок", "Касіў Ясь канюшыну", "Там у полі вярба", "Бывайце здаровы”, “Ой, за гаем зеляненькім","Капаў, капаў крынічаньку" і інш. Хораша спяваюць у Бабраўніках гэтыя і іншыя песні Петрык Галіна, Мураўская Галіна, Калтан Ніна, Аркатава Алена, Гражуль Жанна, Тумінскі Часлаў, Бразевіч Люцыя, Тумінскі Анатоль.

# ФЛОРА І ФАУНА

Вёска Бабраўнікі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці і яе акруга знаходзіцца на захадзе паўночнай часткі БССР на 53 градусах сярэдняй шырыні і на 30 градусах в.д. у падзоне змешаных лясоў. Раслінны покрыў шматвобразны і прадстаўлены ляснымі, балотнымі і лугавымі раслінамі. Значная частка тэрыторыі ўзарана і занятая культурнай расліннасцю. Сустракаюцца *ў* гэтай мясцовасці такія дрэвы як бяроза, асіна, алешына, дуб, клён, ясень, ліпа, сасна, елка. Балотныя мясціны ўсе асушаны і ўзрыхлены.На іх вырошчваюць жыта, авёс, ячмень, пшаніцу. Тут рэдка сустракаюцца лугі. Яны з'яўляюцца галоўнымі сенакоснымі ўгоддзямі. На лугах растуць злакі, двудольныя бабовыя расліны, сустракаецца асака. Лугі ачышчаны ад кустоў. У летні час выкарыстоўваюцца для пашы калгасных кароў, коней.

Жывельны свет для падзоны змешаных лясоў прадстаўлены рознымі відамі жывёл: млекакормячых, птушак, земнаводных. Размешчаны віды жывёл нераўнамерна. Вельмі часта сустракаюцца маленькія жывёлы: казуля, ліса, заяц, вавёрка. З драпежных сустракаецца воўк. У лясах жывуць розныя птушкі: дзятлы, івалга, салавей, сава, рабчык. У палях і каля хатаў гняздзяцца жаваранкі, шпакі, ластаўкі, гракі, курапаткі. Клімат дадзенай мясцовасці: умеранна-кантынентальны. На яго фарміраванне вялікі ўплыў робяць паветранныя вільготныя массы, якія накіроўваюцца ад Атлантычнага акіяна. Сярэдняя тэмпература у чэрвені +17,5 градусаў С. Рэзкіх хістанняў тэмпературы не назіраецца. Ападкаў выпадае 500-650 мл. у год. Большая частка выпадае летам, а зімой колькасць іх —- змяншаецца. Вясна пачынаецца ў канцы сакавіка і доўжыцца два месяцы. Лета доўжыцца болып трох месяцаў. Тэмпература ў летні час пастанная. Часта выпадаюць ападкі ў выглядзе навальнічных дажджоўВосень працягваецца бол двух месяцаў. На пачатку восені тэмпература паветра зніжаецца ніжэй +10 радусаў С, ападае паступова.Пачатак восені, верасень месяц часта бывае сонечным і сухім. Зіма працягваецца болей трох месяцаў. Снегавы покрыў неаднолькавы.